Ігар Сідарук

# ЧАРНАБЕЛ

**Вершы**

**Кобрынь**
**1991**

KAMUNIKAT.org

## Прага волі

зьбег з буды сабака
шукаць
мацьнейшы
ланцуг

10.04.91

* * *

урэшце ўсё роўна
чым зьвязваць рукі
калючым дротам
ці чайнаю ружаю

23.09.91

## Каляктыўнае

Я чытае газэту.
І ты чытаеш газэту.
І ён чытае газэту.
Мы сядзім побач.
Мы ня ходзім у каапэратыўныя
прыбіральні.

KAMUNIKAT.org

3.03.91

Рэкляма

купіце кампутар!
цудоўны кампутар!
лагодны кампутар!
разумны кампутар!
“Капіталізм – гэта Савецкая ўлада
плюс кампутарызацыія ўсёй краіны!”
лірычны адступ
у праграме Бэйсыка:
на калгасным двары
заўтра здохне
апошні конь.

11-12.04.91

* * *

раніцою ён чыста галіўся
падразаў ахайненька вусікі
і нёс у лямбард
закладваць
чарговае перакананьне

няма больш сьмярдзючай рэчы
як бочка з надпісам
“СЬВЕЖАЯ РЫБА”

7.08.91

Беражыце зрок!

у Краіне Сьляпых
заляпіце вочы
плястылінам!
бо ў Краіне Сьляпых
асьляпляльна
бяздоннае
неба

6.08.91

Вялікая палітыка

калі на грамадзкім сьметніку
запішчыць
пацук-ненажэра
які
не прасуне ў шчыліну
засіленага ката
кінуся
шукаць хвалю
Каралеўства Мышынае Мітусьні –
няйнакш
палітычная
правакацыя

10.04.91

## Натуральная ежа

галодны
зьеў на вячэру
газэту
мінаносец у страўніку
расстраляў дзіцячыя цацкі
нацыянальны канфлікт
на глебе кучаравасьці валасоў
абдзёр да крыві
кішкі
нафтавай адрыжкай
дало ў нос
братаньне ўсьмешлівых каралькоў
і ў горле захрас камяк
сумленнай хлусьні
праўдалюбцаў

10.08.91

## Задачка

з пункту А ў пункт Б
выцеклі дзьве трубы
бярозавік
пахне

гумаю
колькі
заворана
кінутых камбінэзонаў
у забэтаваны пляц?
заўтра ўзыйдуць гумовыя палыны
з пункту А ў пункт Б
па сьцёкавых трубах
выцякае
белая кроў...

28.09.91

## Пацеха

на пацеху
дзеткам
апухлым ад стронцыю
дзецюкі ў пільчаках “Москвашвеи”
топяць у лужыне
кацяня
маленькае
цяўкае
захлынаецца
брудную жыжаю
                    адбіваецца
                    ў глыбокіх
                    усьмешлівых вачанятах
“дзеткі разумныя
дзеткам весела” –

габлюе
чорныя дошкі
бацька
які
больш ня ўмее
плакаць.

23.07.91

* * *

тэлефон
страляе
слухаўка перагрэлася

бы руля
і немагчыма
адвесьці ўбок
здраньцвелую руку
тэлефон страляе
маўчаньнем

20.08.91

* * *

натоўп
зьбіў
чалавека
таптаў
            чаравікамі

твар
чалавек
сьмяяўся
бо
ня ведаў
ці дазволяць
сьмяцца
т а м ...

15.04.91

* * *
зь дзіркаю ў галаве
так добра
абдумваць урадавыя ўказы
загадана:
усім пагаліцца
нават жанчынам
бабулькам
выдаць салдацкія боты
толькі 42-га памеру
ў пясочніцах
правесьці
інвэнтарызацыю
насельніцтву (ня блытаць з народам!)
раздаць
аднолькавыя вушы
якія так добра пасуюць
да дзірак у галаве

20.08.91

* * *

...і пайшоў зь неба вогненны дождж
...і кінуліся ўсе ў бранаваны лаз
...і засталіся на зямлі трое
апаленых

а раніцою
паднялі іх на ратушу
адламалі на гадзіньніку стрэлку –
доўжылі
хвіліну жалобы

спусьціліся
панесьлі па вуліцах
і
“тысяча сто сорак першая”
трымалі зьлічво
падмаляваных сьлёзаў
рушылі па кальцавой дарозе

...і першую яміну пясок зацярушыў
...і згарнулася ў другой вужака
...і плявалі ў трэйцюю
пуставокія
далакопы

27.09.91

## Чарвяк

чарвяк абжэрся
зрабілі прамыўку страўніку
не ачуняў
увялі фізіялягічны раствор
яшчэ горш
ужылі электрашок
здрыгануўся
і…
пахавалі з пашанаю
                салютаваньнем
                разьвітальнай прамоваю
паставілі маўзалей
мармуровыя пліты жарэ
новы
чарвяк.

20.08.91

## Рарытэт

праз сорак гадоў
пачнуць прыставаць унукі
дзеду раскажы
аб дзіўным часе
перабудовы
моўчкі
дам патрымаць ім

у кволых руках
гумовы дубец
з двума рабочымі канцамі

11.04.91

* * *

У пакінутым горадзе,
абгрызеным жамярою,
хутаецца на скразьняку
чалавек-помнік.

Волка...

27.09.91

* * *

ён
надзене на голаў
трохлітровік
будзе хадзіць па горадзе
кленчыць міласьціну
“дайце
былому касманаўту на харч
прападаю
бы лядашчы сабака”
увечары ён памрэ
трохлітровік
пакоціцца па бруку

расколецца
лядашчы сабака
будзе доўга нюхаць
аскепкі

22.07.91

* * *

нават дзеці
ўмеюць хлусіць
нават дзеці…

15.04.91

* * *

На саламяны дах
закацілася кола.
Я ня мог адгадаць, чый сьмех,
бы самотнік,
хаваўся ўвесь ранак
у студні…
Радыё перадало:
“У копах
кандэнсуецца памяць.
Таму працэс нараджэньня цяляці
немагчыма зьняць
з касьмічнага спадарожніка”.
І ўспыхнула згаслая дзедава люлька,
закурэў зарослы падворак,

і пайшоў пазалеташні сьнег…

9.05.91

* * *

У ліпеньскую сьпякоту,
калі расплавяцца бы плястылін
кэрамічныя ізалятары
на слупах высокай напругі,
на тваіх вуснах
будзе блішчэць
кропля белага
дзьмухаўцовага
малака,
якою
я ўваскрашу
гаркавую смагу
жаданьня.

10.05.91

* * *

Зноў ня шлюць часапісы дзякло…
Паштальён, як і вецер, прыносіць
толькі шматкі
восеньскага туману.

Зноў куламесы ў нашых сталіцах…
Я выходжу на пляц,

дзе спыняецца апошні аўтобус.
У цемры салёну –
толькі шоргат
скамечаных газэтаў і твараў.

Зноў халодны, касы хвошча дождж…
Я блукаю па вуліцах,
блытаюся ў пад”ездах,
заходжу ў чужыя кватэры.
Доўга, мокры, стаю ў калідорах,
але мяне ніхто не заўважае.

Зноў трэба вяртацца.
Адмыкаю замок,
перакульваю крэсла і чую:

“Не запальвай сьвятла…”

1990

* * *

“Тавары ў крэдыт для прамахадзячых”.
“Інкубатар пазычак”.
“Перавозка капрызаў”.
“Пункт прыёму дывановага пылу”.
“Сьлёзы марожаныя”.
Бясконца праносяцца перад намі фургоны,
калі мы стаім

па розных баках
пустэльнай вулкі...
27.09.91

* * *

да Паэта падманутых
прыйшла дзяўчына
хацеў прысьвяціць ёй верш
ды не знайшоў
патайных тры гузічкі

Мастак запляваных вуліцаў
цалаваў камень
хацеў вымасьціць брукаванку
да неба
ды зьбіў малатком пазногаць

Джазмэну апусьцелых кавярняў
замовілі ўваскрасіць
мэлёдыю жальбы
хацеў загарнуцца ў Турынскую плашчаніцу
ды яе разадралі
на анучы калекі

і пайшоў Паэт па віно
і пацёгся Мастак у бардэль
і зайграў Джазмэн
на саксафоне

прыцемку

08.91

* * *

Недзе ў райскіх садах
гніюць на галінах
сынтэтычныя яблыкі.

29.09.91

Шпацыр з кавалкам сонца ў восеньскі дзень

дзьве бабулькі футболяць
бляшанку

падгалісты акулярык
зьняў капялюш
павуту
да палёў прычапіў
кавалера
не заўважылі
спакусьліва стрункія ногі
якія
ўсё далей усё далей
усё прывабней…
за шоргатам міні-спаднічак

палюе
сьпічастае лісьце клёнаў

заўтра
пакіне шыльду “Прадукты”
і ўзмые за выраем птушак
узьнёслая літара “П”...

27.09.91

* * *

яна ўключае газавую пліту
працірае вакно
ўзіраецца ў восень
па шыбе маруднымі кроплямі
сасьлізгаюць хвіліны
шарасьць
за вакном
на лаўцы ў клячастай кяпурцы
сядзіць
Нерухомы
цяжэе ануча
някрануты пачак сярнічак
на падваконьні

29.09.91

* * *

з гонарам гіне гарбатнік
паіў мора

зёлкамі
мора зьмеяняцямі чхала
ўдзячнае
лашчыла бок
мужлану з карвэту “Пытальнік”
вяргіні плылі
ў зялёнае неба
чорнае
разьятранае
на небе несупадзеньняў
выпадзе Zero
з гонарам гіне
гарбатнік
захлынаецца ў моры…

22.04.91

## Распродаж

Па панядзелках –
польскую парфуму.
Па аўторках –
собскія гуркі.
Па серадах –
дзіравыя панчохі.
Па чацьвяргах –
прагорклыя чакаляды.
Па пятніцах –
заморскае віно.
А па суботах –
айчынную эротыку.

У нядзелю на кірмашы
прадаюць што заўгодна.
А я стаю з пустымі кішэнямі
і губляю надзею
памяняць усьмешку зьняверцы
на забытыя гукі віёлы.

23.07.91

Шафа з чортам

птушыным малаком у гаршчэчках
штодня частуемся з краляю
смак! чмок! чмяк!
верашчыць мэханічны грак
фьюсь! сьвісь! ка-ар!
ежагатавальны камбайн
адчыніць бар
падрыхтуе кактэйль
тэрміновых аб”яў
“мяняю
збор сваіх твораў
на шафу з чортам –
майстрам гульні ў “спортлато”
“Надакучыла ўсё!
Куплю пісталет.”

ды не прадасьць ніхто…

27.09.91